СТРАТА

# Пётр Яраслававіч СЯМІНСКІ



## 1963 - 2021

**28 студзеня 2021 года пайшоў з жыцця член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы гродзенскі паэт, празаік Пётр Яраслававіч Сямінскі.**

**Нарадзіўся Пётр Яраслававіч у вёсцы Калбасіно Гродзенскага раёна. Скончыў фізічны факультэт ГрДУ імя Янкі Купалы. Працаваў настаўнікам у СШ № 34 г. Гродна. Пачаў выступаць у друку з 1983 года. Гэта быў чалавек вялікага сэрца і чыстай душы, заўсёды апантаны, узнёслы, вечны фантазёр, летуценнік, прыдумшчык. Пра такіх звычайна кажуць «вялікае дзіця», а калегі любоўна называлі яго Пятро-рамантычнае нутро. Сярод чалавечых якасцяў Пятра Яраслававіча ў першую чаргу варта адзначыць дружалюбнасць, надзейнасць, шчырасць, прыстойнасць. Паэт спакойна ставіўся да славы. Ніколі не адмаўляўся ўзяцца за любую, нават не вельмі прэстыжную творчую працу. Гэта быў чалавек рэдкага абаяння, унікальнага пачуцця гумару і артыстызму. Кожная яго асабістая сустрэча з чытачамі ператваралася ў яркі спектакль, у свята іскрыстых эмоцый і незабыўных вобразаў. Нягледзячы на мяккасць характару і рамантычнасць сваёй творчай натуры, Пётр Сямінскі праявіў сябе сапраўдным патрыётам-дзяржаўнікам, актыўным і прынцыповым грамадскім дзеячам; заўсёды знаходзіўся на перадавой не толькі культурнага, але і грамадскага жыцця Беларусі. ...У гэтую страту немагчыма паверыць. Зноў і зноў пацвярджаецца горкі і трагічны закон: Бог забірае лепшых. Кажуць, што незаменных няма. Пасля сыходу Пятра Сямінскага ў нашым свеце ўтварылася пустэча, якую не атрымаецца запоўніць нікім і нічым. Гродзеншчына літаратурная страціла самабытнага, таленавітага аўтара, а наша пісьменніцкая сям'я – сапраўднага сябра, аднадумца, фактычна роднага чалавека. Любоў, павагу, удзячнасць і светлую памяць пра гэтага цудоўнага чалавека, гродзенскага паэта, празаіка Пятра Яраслававіча Сямінскага мы будзем вечна захоўваць у нашых сэрцах.**

**Калектыў<br>Гродзенскага абласнога аддзялення<br>Саюза пісьменнікаў Беларусі**